# Праваабаронцы за свабодныя выбары

(//spring96.org) (http://www.belhelcom.org)




# Суд адмовіў Уладзіміру Кацору ва ўключэнні ў Гомельскую абласную камісію

25.05.2020



(//spring96.org/files/images/sources/kacora-2.jpg)

Уладзімір Кацора. Фота: gomelspring.org

Суд не задаволіў скаргу сябры АГП з Гомеля **Уладзіміра Кацоры** на неўключэнне яго ў склад Гомельскай абласной камісіі па выбарах прэзідэнта.

Яшчэ 18 траўня прайшло сумеснае паседжанне прэзідыума Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў і Гомельскага аблвыканкама аб утварэнні Гомельскай абласной выбарчай камісіі. На 13 месцаў членаў камісіі прэтэндавалі 19 чалавек, сярод якіх **Галіна Бялова** ад Партыі БНФ, **Таццяна Канеўская** ад БНФ “Адраджэнне” і Уладзімір Кацора ад АГП.

Назіральнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” **Леанід Судаленка** і **Віктар Адзіночанка** назіралі за ходам фармавання камісіі анлайн. Яны адзначаюць, што падчас паседжання вялікая ўвага надавалася асабістым якасцям вылучэнцаў і іх папярэдняму вопыту ўдзелу ў выбарчых кампаніях.

> *“Было выразна бачна, як ішло галасаванне. У тых выпадках, калі старшыня **Генадзь Салавей**, ён жа старшыня аблвыканкама, уздымаў руку “за”, усе іншыя таксама галасавалі аднагалосна, у тых выпадках, калі ён не ўздымаў руку, галасавалі па некалькі чалавек”, - падкрэсліў Леанід Судаленка.*

Віктар Адзіночанка адзначыў:

> *“Склалася ўражанне, што было загаддзя вядома, хто ўвойдзе ў камісію, бо як толькі скончылася галасаванне, старшыня аблвыканкама Генадзь Салавей, не запінаючыся і без нейкіх намаганняў, зачытаў склад камісіі”.*

У выніку ніхто з апазіцыйных прадстаўнікоў у склад камісіі не патрапіў.

Уладзімір Кацора падаў скаргу ў Гомельскі абласны суд, які правёў пасяджэнне 22 траўня ў 15 гадзін. Суддзя **Ягорава С.** прыйшла да высновы пакінуць скаргу без задавальнення.

# Хто ў складзе Гомельскай АВК?

Такім чынам ў Гомельскую абласную выбарчую камісію абраныя:

**Ярмак Сяргей** ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Народнай Згоды

**Жукевіч Міхаіл** ад ГА “Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане”

**Зубец Васіль** ад грамадзянаў шляхам падачы заявы

**Курыленка Аляксандр** ад Камуністычнай партыі Беларусі

**Ліпоўская Юлія** ад ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”

**Лук'яненка Тамара** ад ГА “Беларускі саюз жанчын”

**Няверaў Аляксей** ад Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму

**Руеў Мікалай** ад Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці

**Сіроткін Кірыл** ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі

**Старасценка Дзмітрый** ад грамадзянаў шляхам падачы заявы

**Сусарэнка Ала** ад грамадзянаў шляхам падачы заявы

**Чарнаштан Уладзімір** ад Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў

**Чумакоў Дзмітрый** ад РГА “Белая Русь”

У параўнанні з выбарамі прэзідэнта ў 2015 годзе, у цяперашні склад камісіі патрапілі пяць чалавек (трошкі менш за палову) з тых, хто лічыў галасы выбаршчыкаў у папярэдняй прэзідэнцкай кампаніі.

*"Праваабаронцы за свабодныя выбары"* (https://elections2020.spring96.org/)

Dit is interessant +1 Tweet

# Каментары

0 Комментариев

Войти ▼

Начать обсуждение...

ВОЙТИ С ПОМОЩЬЮ ИЛИ ЧЕРЕЗ DISQUS

Имя

Поделиться

Лучшие Новые Старые

Прокомментируйте первым.

Подписаться Privacy Не продавайте мои данные

DISQUS

**Паведаміць пра парушэнне:**
**elections2020@spring96.org (mailto:elections2020@spring96.org)**

## Важныя тэлефоны

Цэнтральная камісія: **+375 17 327-19-03 (tel:+375173271903)**

Генеральная пракуратура: **+375 17 378-55-41 (tel:+375173785541)**

Пракуратура г. Мінска: **+375 17 374-23-53 (tel:+375173742353)**

Адміністрацыя прэзідэнта: **+375 17 222-32-17 (tel:+375172223217)**

## Відэа

**Лекцыя для назіральнікаў**

# Стаць назіральнікам

**Запоўні форму, каб стаць назіральнікам**

# Дакументы (/be/documents)

- Кодэкс паводзінаў удзельніка Кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” (//spring96.org/files/misc/2020/2020-code.pdf)
- Дапаможнік па назіранню за выбарамі (//spring96.org/files/misc/2020/2020-monitoring-toolkit.pdf)
- Узор пратакола аб вылучэнні сябра грамадскага аб’яднаня ў якасці назіральніка ў тэрытарыяльную, выбарчую камісію (//spring96.org/files/misc/2020/01.rtf)
- Узор заявы аб вылучэнні назіральніка ў тэрытарыяльную выбарчую камісію шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў (//spring96.org/files/misc/2020/02.rtf)
- Узор заявы аб вылучэнні назіральніка ва ўчастковую выбарчую камісію шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў (//spring96.org/files/misc/2020/03.rtf)
- Узор заявы назіральніка аб парушэнні Выбарчага кодэкса на імя старшыні ўчастковай выбарчай камісіі (//spring96.org/files/misc/2020/04.rtf)
- Узор акта аб парушэнні выбарчага заканадаўства на выбарчым участку (//spring96.org/files/misc/2020/05.rtf)
- Узор заявы назіральніка аб парушэнні выбарчага заканадаўства на імя пракурора (//spring96.org/files/misc/2020/06.rtf)
- Формы для назіральнікаў (//spring96.org/files/misc/2020/forms.zip)

## Карысныя спасылкі

- rec.gov.by (http://rec.gov.by/)
- spring96.org (http://spring96.org/)
- belhelcom.org (http://belhelcom.org/)

## Аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Поўны тэкст

05.08.2020

## Працэс акрэдытацыі назіральнікаў кампаніі “Правабаронцы за свабодныя выбары" і пачатак назірання за датэрміновым галасаваннем

03.08.2020

## Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 27 ліпеня – 2 жніўня 2020 года

E-mail: viasna@spring96.org (mailto:viasna@spring96.org) | Пры выкарыстаньні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая